Грамадскае аб’яднанне
бацькоў неданошаных дзяцей

# Гадавая справаздача

РАНО 2024



- На 1 студзеня 2025 года колькасць членаў аб’яднання – **310**

- Колькасць сем’яў, якія атрымоўваюць інфармацыйна-кансультацыйную дапамогу ў viber-чатах у рамках праекта **«Рана Анлайн»**, – **каля 1100**

# Асноўныя праграмы і праекты ў 2024 годзе:

- «Рана Анлайн»
- Псіхалагічная падтрымка
- Роўнае кансультаванне
- «Школа бацькоўства»
- «Экспертыза»
- «Дакранайся цеплынёй»
- Бонусная праграма

# «Рана Анлайн»

Колькасць удзельнікаў viber-чатаў - каля **1100 чалавек.**




Бацькі **ў фармаце 24/7** атрымоўваюць **інфармацыйна-кансультацыйную падтрымку** кансультантаў-валанцёраў, якія ўжо маюць свой бацькоўскі досвед.

Некаторыя з кансультантаў маюць медыцынскія спецыяльнасці ці з’яўляюцца спецыялістамі дапамагаючых прафесій і ў сваіх рэкамендацыях аб’ядноўваюць бацькоўскі, медыцынскі і псіхолага-педагагічны досвед.

У 2024 годзе ў чатах аказвае падтрымку бацькам **25 кансультантаў-валанцёраў.**

# «Рана Анлайн»

Колькасць удзельнікаў viber-чатаў - каля **1100**

За 2024 год у чаты «Рана Анлайн» далучыліся **147 чалавек,** з іх у чат «ПрэРана» (бацькі, чые неданошаныя дзеці знаходзяцца ў рэанімацыі) - **60 чалавек**, «Ранабілітацыя» (бацькі неданошаных дзяцей з асаблівасцямі развіцця) - **19 чалавек.**




За 2024 год у чаты «Рана Анлайн» паступіла **1688 запытаў** анлайн ад бацькоў неданошаных дзяцей першага году жыцця па догляду, развіццю, рэабілітацыі і сацыяльна-прававым пытанням ад **422 сем’яў**, у тым ліку ад сем’яў, якія выхоўваюць дзяцей з асаблівасцямі развіцця - **297 запытаў.**

# Праект «Школа бацькоўства»

## Трэнінгі ва ўстановах аховы здароўя

**Трэнінг інструктара ЛФК** для супрацоўнікаў УЗ «Клінічны радзільны дом Мінскай вобласці»







**Трэнінгі кансультантаў па грудным гадаванні** ва УАЗ «Віцебскі абласны дзіцячы клінічны цэнтр» і УЗ «Гомельская абласная клінічная бальніца»

# Праект «Экспертыза».
## Навучальныя мерапрыемствы для бацькоў

**Індывідуальныя кансультацыйныя трэнінгі інструктараў па ЛФК**
«Практычныя рэкамендацыі па масажу і ЛФК у хатніх умовах»







Трэнінгі наведалі **14 сем'яў** разам з неданошанымі дзецьмі (Мінск, Гродна, Віцебск)

# Праект «Экспертыза».

## Навучальныя відэаэфіры для бацькоў

Навучальныя відэаэфіры з вузкімі спецыялістамі - **оталарынголагам, рэабілітолагам, акушэрам-гінеколагам, афтальмолагам.**












# Псіхалагічная падтрымка



- Вочныя сустрэчы «ПраЖывая»
- Групы псіхалагічнай самадапамогі «Чайныя сустрэчы»
- Індывідуальныя псіхалагічныя кансультацыі ў крызісных сітуацыях
- Дыстанцыйная псіхалагічная падтрымка ў рамках праекта «Рана Анлайн»

Псіхалагічнае суправаджэнне бацькоў – важны накірунак нашай працы, які ў рознай ступені рэалізуецца ў рамках амаль усёй нашай дзейнасці.

У рамках праекта **«ПраЖывая»** у 2024 годзе псіхолаг Вольга Скарбенка правяла **12 груп** псіхалагічнай падтрымкі, **20 бацькоў** неданошаных дзяцей прынялі ўдзел у гэтых сустрэчах у Мінску.



# Псіхалагічная падтрымка



**Групы псіхалагічнай падтрымкі**
бацькоў неданошаных дзяцей
у розных фарматах наведалі
**11 сямей.**









**Крызісныя індывідуальныя псіхалагічныя кансультацыі** былі арганізаваны для **3 сямей** з неданошанымі дзецьмі.

# Роўнае кансультаванне
## Сустрэчы з бацькамі неданошаных дзяцей

**Ніхто не можа так зразумець бацькоў неданошанага дзіцяці, як другі бацька неданошанага дзіцяці.**

**Роўнае кансультаванне** - працэс інфармацыйна-псіхалагічнай падтрымкі, які аказваецца чалавекам з пэўным жыццёвым досведам вырашэння медыцынскай і/або сацыяльнай праблемы, у нашым выпадку - з досведам нараджэння, догляду, развіцця і рэабілітацыі неданошанага дзіцяці.

У 2024 годзе адбылося **26 сустрэч** роўных кансультантаў ва ўстановах аховы здароўя **ва ўсіх рэгіёнах Беларусі.**





# Экспертнасць бацькоўскай супольнасці

10 чэрвеня 2024 г. - круглы стол **«Педыятрычная паліатыўная дапамога: 100000 дзяцей у краінах PACED»**, арганізаваны дабрачынным фондам PACED (Велікабрытанія). У абмеркаванні прыняла ўдзел старшыня праўлення ГА «Рана» Вольга Скарбенка.

19-20 лістапада 2024 г. - навукова-практычны форум **«Інклюзіўная адукацыя: спрыяльнае асяродде для рэалізацыі патэнцыялу кожнага дзіцяці»**. Арганізатары - Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь пры падтрымцы ЮНІСЭФ.






# Партнёрскае ўзаемадзеянне

- 25 кастрычніка 2024 г. - ГА «Рана» на міжнароднай канферэнцыі з нагоды 30-цігоддзя Дабрачыннага дзіцячага хоспіса **«Уплыў тэхналагічных, эканамічных і гуманітарных фактараў на развіццё паліатыўнай дапамогі дзецям і маладым дарослым»**.




- 6 лютага 2024 г. - вэбінар ЮНІСЭФ **«Маніторынг развіцця дзіцяці - прынцыпы, падыходы і інструменты»**.




- 20-21 верасня 2024 года- анлайн-канфэрэнцыя па падтрымцы бацькоўства **«Postpartum conference»**; арганізатар «ЧК Дзеці» (Расія).



# Партнёрскае ўзаемадзеянне

- 15-16 чэрвеня 2024 года – удзел у сямейным фестывалі **«Горад прафесій Букідс»**.

- 25-27 кастрычніка 2024 года – удзел у 11-ай спецыялізаванай выставе **«Мацярынства і дзяцінства»**.






# Інфармацыйныя кампаніі EFCNI

- 22 мая 2024 –
  Сусветны дзень прээклампсіі

- 1-7 жніўня 2024 –
  Сусветны тыдзень груднога гадавання
  (Сустрэчы з кансультантамі па грудным гадаванні у Мінску, Віцебску і Гомелі)







powered by
global alliance for newborn care
EFCNI european foundation for the care of newborn infants
supported by
РАНО

# Дабрачынныя акцыі

**5 верасня -** Міжнародны дзень дабрачыннасці

**#ШчодрыАўторак -** штогадовы дзень дабрачыннасці



РАНО

**Міжнародны дзень дабрачыннасці**

**5 верасня**



# «Дакранайся цеплынёй»

**У рамках праекта «Дакранайся цеплынёй» мы прапануем усім ахвотным:**

- звязаць шкарпэткі, шапачкі і камізэлькі для неданошаных дзяцей, якія знаходзяцца на этапах рэанімацыі і выходжвання;
- звязаць «сонейкі», «васьміножкі» - самыя першыя цацкі неданошаных немаўлят з тэрапеўтычным эфектам;
- пашыць чахлы, матрацыкі для кювеза, неабходныя для стварэння камфортных светлавых і пазіцыйных умоў, набліжаных да ўлоння маці;
- ахвяраваць прадзіва і іншыя матэрыялы, неабходныя для стварэння вязаных вырабаў і тэрапеўтычных цацак для неданошаных нованароджаных дзяцей.




**У 2024 годзе мы перадалі** для матуль ва установы аховы здароўя, дзе выходжваюцца неданошаныя дзеці нашай краіны, **больш за 800** камплектаў вязаных рэчаў

# КСА і дабрачыннасць

Арганізацыя і правядзенне святочных мерапрыемстваў ГА «Рана»



ГА «Рана» - партнёр праграмы «Дабрачынныя паездкі» **Яндекс Go** ў Беларусі




Падарункі для мам на другіх этапах выходжвання да Міжнароднага дня неданошаных дзяцей 17 лістапада

Салодкія падарункі да навагодніх святаў для валанцёраў і супрацоўнікаў ГА «Рана»

# Бонусная праграма

ТОМОГРАФИЯ
МЕДИЦИНСКИЙ ЦЕНТР

НОВАМЕД
МЕДИЦИНСКИЙ ЦЕНТР

Яндекс Go

- пагадненні аб супрацоўніцтве з бізнэсам ў інтарэсах сямей з неданошанымі дзецьмі
- спецыяльныя зніжкі і акцыі для членаў ГА «Рана»

РАНО

30 %

7 лет

ТОМОГРАФИЯ
МЕДИЦИНСКИЙ ЦЕНТР

**с 1 по 7 июня**
**на весь детский приём**

# Супольнасць бацькоў ГА «Рана»

## **12 мая** – дзень народзінаў ГА “Рана”. **Нам 7 гадоў!**
















# Супольнасць бацькоў ГА «Рана»

- 1 чэрвеня – Міжнародны дзень абароны дзяцей
- МамслётРана – 2024 у Мінску і Віцебску








- 14 кастрычніка – Дзень маці
- 21 кастрычніка – Дзень таты
- «Таемны Зюзя»













# Супольнасць бацькоў ГА «Рана»

## 17 лістапада – Міжнародны дзень неданошаных дзяцей




Рэспубліканская акцыя
**«Дзякуй за жыццё»**



У рамках акцыі нашыя бацькі са сваімі ўжо вялікімі і амаль самастойнымі неданошанымі дзецьмі сустракаюцца з персаналам устаноў аховы здароўя, дзе выходжваліся іх дзеці, каб яшчэ раз сказаць **«дзякуй»**.

**Акцыя адбылася ў Мінску, Брэсце, Віцебску, Наваполацку, Гродне, Гомелі, Магілёве і Пінску.**

# Супольнасць бацькоў ГА «Рана»

- Неверагодныя гісторыі нашых сем’яў



**«Рожала и думала: на таком сроке ребенок точно не выживет». За 12 лет в семье появились три недоношенных ребенка**

## #Дзеці_Рана

- Нашы маленькія/ вялікія героі.
  Дзеці «Рана» сталеюць, развіваюцца, **жывуць**.















# Наша дзейнасць магчыма толькі дзякуючы падтрымцы неабыякавых людзей.

# **Дзякуй за вашу дапамогу!**

На галоўнай старонцы сайта **rano.by**
вы можаце перавесці дабрачыннае ахвяраванне
Проста націсніце на кнопку Хачу дапамагчы

Дапамагчы праз сістэму ерип

- Дабрачыннасць, грамадскія аб'яднанні / Благотворительность, общественные объединения
  - Дапамога дзецям, дарослым / Помощь детям, взрослым
    - Рана / Рано
      - Дабрачынны ўнёсак /Благотворительный взнос

# Грамадскае аб’яднанне бацькоў неданошаных дзяцей

Грамадскае аб’яднанне бацькоў неданошаных дзяцей «Рана»

Паштовы адрас:

220002, г. Мінск, а/с 80

Тэл. +375(29)121-00-80

info@rano.by

Атрымальнік плацяжу:
ГА бацькоў неданошаных дзяцей «Рана»

Юрыдычны адрас: 220002, г. Мінск,
вул. Старажоўская, д. 8, пам. 17Н

УНП атрымальніка: 805003632

р/р: BY78UNBS30150385190020009933

у ЗАА «БСБ Банк», аддзяленне № 9

Код банка (BIC): UNBSBY2X

Адрас банка: г. Мінск, вул. Я. Купалы, 25

**rano.by**

**Мы побач!**